*Таццяна Казакова (Мінск)*

# МАСТАЦКІ СВЕТ КІРЫЛА ТУРАЎСКАГА І ГРЫГОРЫЯ ЦАМБЛАКА

Пры даследаванні мастацкага свету аўтараў эпохі Сярэдневякоўя неабходна ўлічваць традыцыяналістычны тып мыслення пісьменнікаў, які быў «арыентаваны на трансляцыю гнасеалагічнай нормы» [11, с. 5]. У аснове мастацкага бачання тураўскага епіскапа Кірыла і мітрапаліта Вялікага Княства Літоўскага Грыгорыя Цамблака была «ідэя іканічнай прыроды слова». Прапаведнікі цудоўна валодалі тэорыяй рытарычнага майстэрства, якая была выкладзена ў сачыненнях Гермагена з Тарса і Георгія Хіравоска, творча развівалі вопыт візантыйскіх рытараў, неслі людзям яркае мастакоўскае слова.

У XIX ст. мітрапаліт Макарый і А. Вадкоўскі адзначалі, што стыль твораў Грыгорыя Цамблака вельмі блізкі да аратарскай прозы тураўскага епіскапа Кірыла, якая вылучалася высокім узроўнем прамоўніцкага майстэрства, прыгажосць выказвання таленавіта спалучалася з веліччу духоўнага сэнсу.

Магчыма, меў рацыю І. І. Каліганаў, які выказаў думку, што «пры пераездзе з адной славянскай краіны ў другую ў межах праваслаўнага рэгіёна кніжнікі даволі тонка адчувалі гэтыя адрозненні і чуйна на іх рэагавалі» [4, с. 200]. Ю. К. Бегуноў дастаткова пераканаўча паказаў тапалагічную агульнасць твораў урачыстага красамоўства ў паўднёвых і ўсходніх славян і падкрэсліў: «Кожны святар абавязаны быў вучыць, і аўтарытэт яго пропаведзі асвячаўся аўтарытэтам царквы, якая ў сярэднія вякі была ідэалагічным апірышчам феадальнага ладу» [2, с. 41].

А. А. Мельнікаў пісаў, што мастацкі характар творчай спадчыны Кірыла Тураўскага належыць разумець, зыходзячы з гісторыка-літаратурных пазіцый, бо аўтар XII ст. свядома пазбягаў усялякага выяўлення ўласнадумства ў стварэнні вобразаў. Кірыл Тураўскі называў сябе коласазборцам, а не жняцом. Даследчык лічыў яго творы інтэртэкстамі — непарыўнымі ланцугамі, дабротна скаванымі з узаемадапасаваных запазычанняў, топасаў і цытат. Часта выкарыстоўвае Кірыл Тураўскі сінтаксічны паралелізм, рытарычную ампліфікацыю, антытэзу, рэтардацыю, алегорыю, асноўны рытмічны прынцып у яго творах — ізахранізм [гл.: 10].

Л. В. Ляўшун пераканаўча даказала, што ў пропаведзях Кірыла Тураўскага мы бачым не проста «тэхнічнае» карыстанне рытарычнымі прыёмамі і тропамі, але пэўнае іх пераасэнсаванне на падставе хрысціянскага (адрознага ад антычнага і эліністычнага) светаўспрымання і стаўлення да творчасці: «Фармалізаваныя класічнай грэчаскай рыторыкай “тэхнічныя прыёмы”, трапляючы ў сферу хрысціянскай кананічнай культуры, пераўтвараюцца са сродкаў стварэння тэксту ў сродкі выяўлення сэнсу, з моўных упрыгожванняў — у катэгорыі светаўспрымання» [3, с. 124].

Светапогляд і мастацкі свет Грыгорыя Цамблака сфарміраваліся ў атмасферы грамадска-палітычнага і рэлігійнага жыцця паўднёвых і ўсходніх славян XIV ст., талент прапаведніка разгортваўся на перакрыжаванні дзвюх

літаратурных традыцый — паўднёваславянскай і ўсходнеславянскай, якія ўваходзілі ў сферу візантыйскага ўплыву.

Грыгорый Цамблак быў прыхільнікам і паслядоўнікам філасофіі ісіхазму, якая тэарэтычна была абгрунтавана ў працах афонскіх манахаў Грыгорыя Паламы і Грыгорыя Сінаіта. Ісіхасты тлумачылі не толькі філасофска–рэлігійныя паняцці (фаворскі свет, разумная малітва), але ў іх вучэнні закраналася пытанне аб чалавеку, яны звярталі ўвагу на «ўнутраны» свет асобы, бо «асновай яднання чалавека з Богам з'яўляецца іпастаснае адзінства чалавечай і боскай прыроды ў Хрысце» [гл.: 9]. Згодна з тэорыяй ісіхастаў, чалавек знаходзіць энергію шляхам абрадавага «самапаглыблення», «маўчанне ёсць пакіданне розуму і свету, забыццё ніжэйшых, тайнае "ведение" вышэйшых... гэта і есць сапраўднае "делание", узыходжанне да праўдзівага, шчырае сузіранне» [гл.: 9]. Вучэнне ісіхастаў пабуджала да ўнутранай духоўнай актыўнасці, самазасяроджвання ў малітве, да самаўдасканалення асобы, бо творчая дзейнасць — гэта праця Божага стварэння свету. Пісьменнікі-ісіхасты выключнае значэнне надавалі Слову, верылі ў яго магічную сілу. Слова для ісіхастаў — «святая святых», напісаць слова можна было толькі пасля духоўнага ачышчэння і набыцця ўнутранай дасканаласці. У «Слове на Узнясенне Ісуса Хрыста» Грыгорый Цамблак піша: «*...бывает слово плоть, и одебелевает, яко да бессловесное собою исцелить, яко да поврежденный ум уврачюет, прельщенную душу обратить, и во всем всего цела, и съвершена собою обновить человека*» [12, с. 304]. Але слова не ў стане перадаць сэнс рэчы, найвышэйшы сэнс можна перадаць толькі славесным «віціўствам», таму адметнымі асаблівасцямі «Слоў» Грыгорыя Цамблака з'яўляецца несуразмернасць частак (экзордыум, нарацыя, канклюзія), непаслядоўнасць развіцця сюжэта, вар'іраванне думкі, абстрактны псіхалагізм.

Пісьменнікі ранняга і позняга Сярэднявечча таленавіта выкарыстоўвалі сімвалічную вобразнасць, крыніцай якой была Біблія. Ю. М. Лотман адзначаў, што «сімвал звязаны з памяццю культуры, і цэлы рад сімвалічных вобразаў пранізвае па вертыкалі ўсю гісторыю чалавецтва» [8, с. 123]. Д. С. Ліхачоў, І. П. Яромін, У. У. Колесаў добра паказалі ролю сімвалаў у семантычнай арганізацыі «Слоў» Кірыла Тураўскага. Асноўная асаблівасць выкарыстання прапаведнікам біблейскай сімволікі заключалася ў тым, што сімвалы служылі асновай, выклікалі пэўныя асацыяцыі, царкоўна-гістарычныя аналогіі. Ствараецца два сэнсы — канкрэтны і агульны, твор уздзейнічаў на слухачоў сваім тэкстам і падтэкстам, што дазваляла мастаку слова паказаць сувязь паміж з'я вамі рэальнага жыцця і хрысціянскай гісторыяй.

Грыгорый Цымблак пісаў у экспрэсіўна-эмацыянальным стылі, «усе прыёмы якога разлічаны на стварэнне ў тэксце звыш сэнсу» [6], філасофскую аснову гэтага стылю Д з. С. Ліхачоў бачыў у «тоеснасці слова і сутнасці Божага Пісання», «у пошуках сімвалічных багаслоўскіх суадносінаў» [7].

Даследчыкі творчасці Кірыла Тураўскага неаднаразова адзначалі ў яго пропаведзях перавагу паэтычнага элемента над дыдактычным. Сімволіка–алегарычны план адлюстравання рэчаіснасці дазваляў аўтару выйсці на агульначалавечую праблематыку, рытарычная ампліфікацыя (дамінанта

мастацкага стылю Кірыла Тураўскага) экспрэсіўна і маляўніча разгортвала тэму ў сэнсавым і эмацыянальным плане.

Грыгорыя Цымблака тэолагі называлі «аратарам-мастаком», «паэтам-лірыкам», які таленавіта развіваў традыцыі аратарскай прозы на землях усходніх славян. Мастацкую аснову прапаведніка-ісіхаста сфарміравала ўяўленне пра тое, што слова можа ўвасабляцца, валодае жыватворнай сілай. Грыгорый Цамблак выкарыстоўваў усе прыёмы экспрэсіўна-эмацыянальнага стылю («певец издалеча плетя песнь»), пераконваў інтанацыяй, рытмам, рытмічныя варыяцыі дазвалялі вяртацца да асноўнай тэмы, якая пры гэтым падкрэслівалася і набывала мастацкую экспрэсію. Сімволіка-алегарычны план адлюстравання рэчаіснасці дазваляў аўтару выйсці на агульначалавечую праблематыку.

Значнае месца ў творчасці сярэднявечных рытараў займала праблема маральнага ўдасканалення чалавека. М. Бердзяеў пісаў, што «хрысціянства ўпершыню прызнала бясконцую каштоўнасць чалавечай духоўнасці» [2, с. 92].

Кірыл Тураўскі ў «Прытчы пра душу і цела», у «Слове пра чалавека і нябесныя сілы» і ў «Слове святога Кірыла», разважаючы пра духоўнае і цялеснае, нябеснае і зямное, паказваючы дваццаць «мытарств» чалавека, абапіраючыся на аўтарытэт евангеліста Мацвея, Іаана Багаслова і апостала Паўла, сцвярджае «*што высотою и величеством невозможно изглаголити усты человеческими*» [10, с. 388]. У творах тураўскага епіскапа праз багатую біблейскую вобразнасць і цытацыю тэкстаў Свяшчэннага Пісання, твораў візантыйскіх рытараў, яскрава адчуваецца прыярытэт духоўнага над цялесным, ён верыў у магчымасць чалавечай душы дасягнуць нябеснага царства.

Грыгорый Цамблак успрымае чалавека як вышэйшую разумную істоту, дзеля якой Бог стварыў свет. У пахвальных словах вобразы Яўфімія Тырнаўскага, мітрапаліта Кіпрыяна паказаны на фоне дзейнасці біблейскіх герояў — Аўраама, Майсея, Саламона, апостала Паўла і інш., тым самым пісьменнік уключае асобы асветнікаў у кантэкст сусветнай гісторыі. Спалучаючы прыёмы абстрагавання і псіхалагічнай пранікнёнасці, мітрапаліт Літоўска-Беларускай дзяржавы паказвае адданасць свайму народу патрыярха Яўфімія, ухваляе подзвіг Дзмітрыя Салунскага, які ахвяруе жыццём у імя хрысціянскіх ідэалаў, і сцвярджае, што насілле — праява бездухоўнасці. Абарона роднай веры і культуры, услаўленне нацыянальных і культурных дзеячаў ва ўмовах турэцкага нашэсця былі патрыятычным актам Грыгорыя Цамблака.

Цэнтральнай ідэяй творчасці Кірыла Тураўскага з'яўляецца духоўнае ператварэнне чалавека пры дапамозе кніжнай асветы. У «Прытчы пра душу і цела» тураўскі епіскап сцвярджае: «*Добро убо, братье, и зело полезно еже разумевати нам божественных писаний ученье: се и целомудрену душу стваряет, и к смирению прилагает ум, и сердце на реть добродетели възъстряет, и всего благодарствена стваряет человека, и на небеса к горним обещанием мысль приводит, и к духовным трудом тело укрепляет, и преобидити сего настоящего житья, славы и богатства творит, и всея житийскыя света сего печали отводит*» [10, с. 429].

У творчасці Грыгорыя Цамблака ідэяператварэння з'яўляецца дамінантнай, бо ў аснове яго светапогляду было ўяўленне пра разумовую малітву і фаворскі свет, свет ператварэння, які папярэднічаў царству Бога. Згодна з тэорыяй ісіхастаў, чалавек пры дасягненні вышэйшай ступені дасканаласці мог убачыць фаворскае святло, водбліскі якога маглі адбіцца на ім. Грыгорый Цамблак асабліва падкрэслівае, што яго настаўнік, «пастырь Христова стада» Яўфімій перадаў царкве новыя кнігі — «скрижали истинно небесного съкровища».

Цытацыя, спасылкі на традыцыю і аўтарытэты абумоўлівалі рэтраспектыўную накіраванасць тэкстаў, якая суадносіла творы з папярэдняй гісторыяй і філасофіяй, тым самым уключаючы іх у шырокі культурны і філасофскі кантэкст. Градацыя думкі пісьменніка прасочваецца ў арганічным пераходзе ад дзейнасці герояў біблейскай гісторыі да асабістых перажыванняў, адбываецца «выхад на вертыкаль славеснага пляцення, што дазваляе пераадолець абмежаванні лінейнага члянення традыцыйных формул» [5, с. 94].

Такім чынам, на беларускіх землях Грыгорый Цамблак таленавіта развіваў традыцыі ўрачыстага красамоўства Кірыла Тураўскага, творы тураўскага епіскапа і мітрапаліта Вялікага Княства Літоўскага прасякнуты ідэямі хрысціянскага гуманізму і высокай пашанай да СЛОВА.

Літаратура


1. Бегунов, Ю. К. Ораторская проза Киевской Руси в типологическом сопоставлении с ораторской прозой Болгарии / Ю. К. Бегунов // Славянские литературы. IX Международный съезд славистов. Доклады советской делегации. — М.: Наука, 1983. — С. 38–51.
2. Бердяев, Н. А. Смысл истории / Н. Бердяев. — М.: Мысль, 1990. — 173 с.
3. Гісторыя беларускай літаратуры XI — XIX ст. / Навук. рэд. В. А. Чамярыцкі. — Т. 1. — Мінск: Бел. навука, 2006. — 910 с.
4. Калиганов, И. И. Некоторые черты литературного общения болгар, русских и сербов в эпоху средневековья / И. И. Калиганов // Литературные связи и литературный процесс: из опыта славянских литератур. — М., 1986. — С. 189–211.
5. Колесов, В. В. Средневековый текст как единство поэтических средств языка / В. В. Колесов // Труды отдела древнерусской литературы / РАН; ред. А. А. Алексеев [и др.]. — Спб., 1996. — Т. 50. — С. 92–99.
6. Лихачев, Д. С. Поэтика древнерусской литературы / Д. С. Лихачев. — М.: Наука, 1979. — 352 с.
7. Лихачев, Д. С. «Преодоление слова» в стиле «плетение словес» и историко-литературное значение этого явления / Д. С. Лихачев // Търновска книжовна школа. — София: БАН, 1980. — № 2. — С. 9–26.
8. Лотман Ю. М. Структура художественного текста / Ю. М. Лотман. — М.: Искусство, 1970. — 384 с.
9. Мейендорф, И. Ф. О византийском исихазме и его роли в культурном и историческом развитии Восточной Европы в XIV в. / И. Ф. Мейендорф // Труды отдела древнерусской литературы АН СССР; Институт русской литературы / отв. ред. Д. С. Лихачев. —Т. 29. — С. 291–305.
10. Мельнікаў, А. А. Кірыл, епіскап Тураўскі. Жыццё, спадчына, светапогляд / А. А. Мельнікаў. — Мінск: Бел. навука, 1997. — 462 с.
11. Смирнова, О. А. Повествовательные структуры восточнославянской литературы XI–XII веков: автореф. дис. … канд. фил. наук. — Минск, 2004. — 19 с.
12. Цамблак, Григорий. Слово на Вознесение Иисуса Христа // Нацыянальная бібліятэка Беларусі: Аддзел рукапісаў і старадрукаў. № 214. Торжественник XVIII ст.